# ДЗЕЙНАСЦЬ ПАДПОЛЬНАЙ ГРУПЫ ЛІП-ЦІ Ў ГОРАДЗЕ ВІЦЕБСКУ Ў 1942–1943 гг.

**Чжу Пэйцзя**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, smilelikeachildjia@outlook.com*

У дадзеным артыкуле на падставе дакументаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь разглядаецца дзейнасць падпольнай групы, узначаленай ураджэнцам Кітая Ліп-ці, у горадзе Віцебску ў 1942–1943 гг. Мэта даследавання заключаецца ў асвятленні дзейнасці падпольнай групы Ліп-ці, аналізе яе ўнутранага складу, даследуецца фарміраванне падпольна-разведвальнай сеткі групы і правядзенне дыверсійнай работы.

***Ключавыя словы:*** Вялікая Айчынная вайна; падпольная група; Ліп-ці; Віцебск.

# ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ПОДПОЛЬНОЙ ГРУППЫ ЛИП-ТИ В ГОРОДЕ ВИТЕБСКЕ В 1942–1943 гг.

**Чжу Пэйцзя**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, smilelikeachildjia@outlook.com*

В данной статье на основании документов Национального архива Республики Беларусь рассматривается деятельность подпольной группы, возглавляемой уроженцам Китая Лип-ти, в городе Витебске в 1942–1943 гг. Цель исследования заключается в освещении деятельности подпольной группы Лип-ти, анализе ее внутреннего состава, исследуется формирование подпольно-разведывательной сети группы и проведение диверсионной работы.

***Ключевые слова:*** Великая Отечественная война; подпольная группа; Лип-ти; Витебск.

# ACTIVITIES OF THE UNDERGROUND GROUP LIP-TI IN THE CITY OF VITEBSK IN 1942–1943

**Zhu Peijia**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, smilelikeachildjia@outlook.com*

This article based on the documents of the National Archives of the Republic of Belarus, discusses the activities of the underground group led by Chinese-born Lip-ti in the city of Vitebsk in 1942–1943. The aim of the study is to highlight the activities of the underground group Lip-ti, to analyze its internal composition, to investigate the formation of the underground-intelligence network of the group and sabotage work.

***Keywords:*** Great Patriotic War; underground group; Lip-ti; Vitebsk.

Сёлета спаўняецца 80 гадоў Перамозе ў Другой сусветнай вайне. Прайшло ўжо нямала гадоў, а цікавасць да вайны не згасае да гэтага дня. Падчас Другой сусветнай вайны кітайскі народ вёў 14-гадовую (1931–1945) упартую барацьбу з Японіяй. Разам з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцяў кітайцы змагаліся супраць ворага за межамі Кітая. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны ўраджэнцы Кітая ўступілі ў барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, яны ўдзельнічалі ў барацьбе ў складзе Чырвонай Арміі і ў радах партызан і падпольшчыкаў на тэрыторыі Беларусі, выяўляючы мужнасць і гераізм.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў горадзе Віцебску дзейнічала шырокае, арганізацыйна зладжанае партыйна-патрыятычнае падполле.

11 ліпеня 1941 г. нямецка-фашысцкія войскі акупавалі горад Віцебск. З першых дзён акупацыі горада фашысцкімі войскамі, у Віцебску разгарнулася актыўная барацьба патрыётаў супраць гітлераўскіх захопнікаў і іх памагатых. На чале гэтай барацьбы ішлі камуністы і камсамольцы, узначаленыя мясцовымі падпольнымі партыйнымі і камсамольскімі органамі.

Вясной і летам 1942 г. разгортваецца актыўная праца аператыўна-чэкісцкіх і армейскіх разведвальных груп «Няўлоўныя», М. Р. Яфімава, Ю. С. Рудакова, М. П. Салаўёва, П. А. Крылатых, П. В. Буткевіча і іншых, спецыяльна закінутых для актывізацыі падпольна-патрыятычнай працы ў тыле ворага, збору разведаных, правядзення дыверсій і г. д. Гэтыя групы, абапіраліся на партызанскія атрады і падпольшчыкаў горада, разгарнулі працу па расшырэнні сеткі разведчыкаў. Яны ўсталёўваюць сувязі з дзеючымі і ствараюць новыя патрыятычныя групы. У кастрычніку 1942 г. у Віцебск прыбыла В. Харужая. Звесткі, якія яна перадавала, прадстаўлялі вялікую каштоўнасць для камандавання Савецкай Арміі і партызан [1, л. 16–17].

Нягледзячы на жорсткі акупацыйны рэжым, суровыя рэпрэсіі з боку гітлераўскіх захопнікаў і выкліканыя гэтым сур'ёзныя страты ў шэрагах патрыётаў, падпольная сетка ў горадзе Віцебску ўвесь час расшыралася і ўмацоўвалася арганізацыйна. Як устаноўлена дзейнічала больш за 60 падпольных груп, якія аб'ядноўвалі многія сотні савецкіх патрыётаў. Яны вялі шырокую палітычную працу сярод насельніцтва і варожых фарміраванняў: распаўсюджвалі савецкія лістоўкі і газеты, выкрывалі хлусню фашысцкай прапаганды, здзяйснялі дыверсійныя і тэрарыстычныя акты супраць гітлераўскіх акупантаў і іх прыслужнікаў, забяспечвалі камандаванне Савецкай Арміі і партызанскіх брыгад каштоўнымі разведвальнымі дадзенымі, ратавалі моладзь ад выгану на фашысцкую катаргу ў Германію, садзейнічалі ўцёкам байцоў і камандзіраў. Савецкай Арміі, якія апынуліся ў фашысцкім палоне, з гітлераўскіх лагераў смерці і перапраўлялі іх у партызаны [1, л. 2–3].

Пастановай бюро Віцебскага абкама КПБ ад 25 мая 1982 г. (пратакол № 33, § 5) «Аб уключэнні падпольнай групы, якая дзейнічала ў пральні горада Віцебска, у склад Віцебскага партыйна-камсамольскага патрыятычнага падполля» была прызнана дзейнасць падпольнай групы на чале з камуністам Андрэем Іванавічам Ліп-ці ў пральні ў Віцебску. Група дзейнічала з красавіка 1942 г. па верасень 1943 г. У склад групы ўваходзілі 3 кітайцы (Андрэй Іванавіч Ліп-ці, Васіль Чу-Чалін, Сяргей Сюдаболь) і 2 беларускі (Міра Аляксандраўна Чжан Ван-фу, Зінаіда Аляксандраўна Шаракова) [2, л. 1, 7].

У гады вайны па вуліцы Леніна ў Віцебску працавала адзіная ў той час пральня, куды здавалі ў мыццё бялізну воінскія часткі акупантаў, якія размяшчаліся ў горадзе і яго навакольнай. Сярод працоўных, якія працавалі ў пральні, было шмат асоб кітайскай нацыянальнасці. Усе яны жылі на тэрыторыі Беларусі з дарэвалюцыйных часоў, абзавяліся тут сем'ямі.

На тэрыторыю Беларусі кітайцы патрапілі рознымі шляхамі. Сірату Ліп-ці (1894 г. н.) усынавіў і вывез з Кітая рускі афіцэр. Але Ліп-ці не знайшоў агульнай мовы са сваім прыёмным бацькам, яму было цяжка ад дапамогі бацькі і вельмі рана ўключыўся ў рэвалюцыйную працу. Яшчэ ў падполлі ён уступіў у Камуністычную партыю і самааддана змагаўся за Савецкую ўладу [2, л. 2]. Перад вайной ён працаваў загадчыкам пральні ў трудкалоніі НКУС, у Ліп-ці і яго жонкі Феадосіі Фадзееўны было трое дзяцей: дванаццацігадовы Пётр, дзесяцігадовы Анатоль і чатырохгадовая Тамара. У іх доме на вуліцы 12-й Гарадоцкай, 20/10 (суч. Пскоўская) знаходзілася канспіратыўная кватэра, якую часта наведвалі партызанскія сувязныя і якім дзеці дапамагалі выходзіць з горада. Заўважым, што маюцца і іншыя звесткі: у дакументах Віцебскай гарадской управы перыяду нацысцкай акупацыі пазначана, што на 19 ліпеня 1943 г. Андрэй Ліп-ці пражываў у Віцебску на вуліцы Сувораўскай, 29 з сям'ёй з шасці чалавек, з іх трое былі ва ўзросце да 14 гадоў [3, с. 406].

Васіль Чу-Чалін (1892 г. н.) і Сяргей Сюдаболь (1895 г. н.) прыехалі ў 1914 г. з Пекіна на два гады па вярбоўцы і засталіся на тэрыторыі Беларусі на ўсё жыццё. Удзельнічалі ў складзе інтэрнацыянальных фарміраванняў у Грамадзянскай вайне, абараняючы заваёвы Кастрычніка. Сяргей Сюдаболь удзельнічаў у баях пад Кіевам, Петраградам, змагаўся з бандытызмам у Беларусі. Да вайны працаваў грузчыкам канторы «Заготзерно», быў кандыдатам у члены партыі.

Акрамя кітайцаў, у падпольную групу ўваходзілі: Міра Аляксандраўна Чжан Ван-фу, 1928 г. н., піянерка, да вайны — вучаніца 3-й Сталінскай сярэдняй школы; Зінаіда Аляксандраўна Шаракова, 1926 г. н., ураджэнка Віцебска, беларуска, член УЛКСМ.

Ужо ў красавіку 1942 г. ў пральні, якой загадваў Чу-Чалін, склалася добра законспіраваная падпольная група на чале з камуністам Ліп-ці. Група працавала выразна і строга канспіратыўна [2, л. 3, 7].

Сяргей Сюдаболь членам падпольнай групы стаў з красавіка 1942 г., пасля таго як Ліп-ці аказаў сілу, што камуністы павінны дапамагаць савецкай улады. Па даручэнні кіраўніка групы Ліп-ці ён хадзіў неаднаразова да аэрадрома на адну з Вінчэўскіх вуліц і перадаваў важныя звесткі. Акрамя таго, Сюдаболь збіраў зброю і хаваў у сябе. Чу-Чалін з'яўляўся найбліжэйшым памочнікам кіраўніка падпольнай групы і адказваў за дакладнасць разведвальнай інфармацыі. Немалая заслуга Чу-Чаліна і ў тым, што падпольная група Ліп-ці доўгі час пасяхова працавала без страты і правалаў [2, л. 11 аб., 12 аб.].

Група была звязана з партызанскім атрадам Біруліна, Верай Харужай і разведгрупай Паўла Крылатых.

Праз сувязную Клаўдзію Балдачову група звязалася з атрадам М. Ф. Біруліна. Балдачова Клаўдзія (падпольная мянушка «Бяроза»), пражывала ў вёсцы Койтава Віцебскага раёна, беларуска, беспартыйная. Падпольшчыцай-сувязной працавала з ліпеня 1942 г. [1, л. 61]. Сакратар падпольнага гаркама партыі В. Г. Кудзінаў указваў: «Балдачова была замужам за кітайцам, сваяк якога быў па прозвішчы Ліп-ці». Кватэра Ліп-ці служыла месцам адпачынку Клаўдзіі Балдачовы, яна тут звычайна пераапраналася, мяняла свой вонкавы выгляд, сустракалася з патрэбным людзьмі.

Група Ліп-ці перадавала партызанам каштоўную разведвальную інфармацыю. Па накладных на здадзеную ў пральню вайсковымі часткамі бялізну падпольшчыкі ўстанаўлівалі нумары воінскіх частак праціўніка, месцы іх дыслакацыі і прыкладную колькасць, а таксама час прыбыцця і ўбыцця з гэтага ўчастка фронту.

Але толькі гэтым не абмяжоўвалася дзейнасць групы. Падпольшчыкі здабывалі зброю і бензін для партызан, прыводзілі ў непрыдатнасць вялікія партыі бялізны, перапальваючы іх хімікатамі. Сюдаболь памятае, як аднойчы партызанам было адпраўлена 17 каністраў бензіну. На гэтай жа машыне быў вывезены партызанам хлеб з віцебскага хлебазавода. Сюдаболь даводзілася часам выконваць ролю сувязнога з партызанамі, калі сувязныя не маглі прыйсці ў горад. Звесткі патрабаваліся неадкладна, то пасылалі яго. Ён ішоў у вёску Маркавічы і перадаваў усё неабходнае [2, л. 3, 10 аб., 11 аб.].

Па накіраванні ЦК КПБ у жніўні 1942 г. ў прыфрантавую паласу, у Віцебскі абкам КПБ прыбыла Вера Харужая на чале патрыётак-добраахвотнікаў для падпольнай працы ў акупаваным нямецка-фашысцкімі войскамі горад Віцебск. У сярэдзіне верасня 1942 г. Вера Харужая з часткай

сваёй групы прыбылі ў тыл ворага ў размяшчэнне Віцебскай брыгады. У кастрычніку 1942 г. па прыбыцці пад Віцебск В. З. Харужай яе сувязнай стала вопытная і самаадданая Клаўдзія Балдачова [1, л. 30]. Так, праз сувязную Клаўдзію Балдачову Вера Харужая ўсталявала сувязь з падпольнай групай Ліп-ці.

Удзельніца падпольнай групы ў пральні Зіна Шаракова таксама ўсталявала з Верай Харужай сувязь.

Выходзячы ў Віцебск, Вера Харужая атрымала шмат адрасоў, у тым ліку адрас адной з актыўных удзельніц віцебскага падполля, гаспадыні явачнай кватэры армейскіх разведчыкаў па 5-й Вінчэўскай 17, Матроны Кліменцьеўны Оскер, а таксама адрас і запіску партызана Уладзіміра Германовіча і яго нявесце — Зіне Шараковай. Шаракова жылі недалёка ад аэрадрома і блізка ад Оскер. У адзін з вечароў М. К. Оскер арганізавала сустрэчу Веры Харужай з Зінай Шараковай у сябе на кватэры. З мэтай канспірацыі святло не запальвалася, гутарка праходзіла ў цемры. Харужая назвалася «цёткай Аняй» і сказала, што калі Зіна згодная дапамагаць сваім, то яна павінна паведамляць пра ўсё ўбачанае за дзень Матроне Кліменцьеўне, па магчымасці штодня і толькі вусна, строга выконваць канспірацыю. Харужую цікавіла колькі і якія самалёты знаходзяцца на аэрадроме, куды ляцяць і адкуль прылятаюць, дзе размешчаны бомба і бензасховішчы, нумары воінскіх частак, ахова аэрадрома і г. д.

З гэтага дня З. Шаракова, якая працавала прыбіральшчыцай на аэрадроме, стала баявой памочніцай Веры Харужай. Па просьбе М. К. Оскер Зіна Шаракова двойчы хадзіла ў пральню на вуліцы Леніна, каб сказаць кітайцу (прозвішчы яна не памятае), што ў іх сапсавалася швейная машына. Другі раз, што машына па-ранейшаму не працуе. З. А. Шаракова мяркуе, што гэта быў пароль. Штодня пасля працоўнага дня Зіна прыходзіла да Оскер, двойчы стукала ў дзверы і падрабязна расказвала пра свае дзённыя назіранні. Так працягвалася больш за месяц [2, л. 5].

13 лістапада 1942 г. арыштаваны Вера Харужая і Клаўдзія Балдачова [1, л. 61]. Пасля правалу Веры Харужай падпольная група ў пральні не была выкрыта.

Праз сясцёр Чжан-Ванфу Ірыну і Міру група звязалася з армейскай групай Паўла Крылатых і рэгулярна перадавала сюды каштоўную інфармацыю.

Ірына і Міра Чжан Ван-фу былі дочкамі чалавека, вядомага ў даваенным Віцебску. Камуніст Аляксандр Іванавіч Чжан Ван-фу з'яўляўся фактычным кіраўніком кітайскай калоніі горада з пачатку яе фарміравання ў 1920-х гг. Быў выхадцам з замежных наймітаў Чырвонай Арміі: у гады Грамадзянскай вайны камандаваў узводам. Пасля дэмабілізацыі служыў

у міліцыі Паўночна-Заходняй чыгункі, затым у гаспадарчым аддзеле Віцебскага гарвыканкама. У 1928 г. стаў адным з ініцыятараў стварэння і старшынёй кітайскага нацыянальнага калгаса ў былым памешчыцкім маёнтку «Маркавічы» пад Віцебскам. З 1934 г. — старшыня сельскага спажывецкага таварыства Мікалаеўскага сельсавета Віцебскага раёна, з 1936 г. — старшыня віцебскай пральні арцелі імя Кітайскай Чырвонай Арміі, напярэдадні вайны — загадчык складам Віцебскага плодаагароднiннага завода. 23 чэрвеня 1941 г. Чжан Ван-фу быў падвергнуты так званаму прэвентыўнаму арышту, як асоба замежнага паходжання, так званы «сацыяльна-небяспечны элемент», і прысуджаны да дзесяці гадоў папраўча-працоўных лагераў [4, с. 73].

30 чэрвеня 1942 г. ў навакольнай горада Віцебска камандаваннем Савецкай Арміі была выкінута спецгрупа пад кіраўніцтвам Салаўёва Мікалая Пятровіча. Група Салаўёва знаходзілася пры партызанскім атрадзе Кірухіна. 28 верасня 1942 г. з-за лініі фронту для папаўнення спецгрупы Салаўёва прыбыў і ўзначаліў кіраўніцтва спецгрупы капітан Крылатых Павел Андрэевіч.

Спецгрупа Крылатых мела заданне па зборы даных аб нямецкіх гарнізонах у гарадах Віцебску і Гарадку, а таксама аб перамяшчэнні нямецкіх войск і тэхнікі праз чыгуначную станцыю Віцебск. Дадзенае заданне група выконвала асабістым наглядам, а таксама праз савецкіх патрыётаў, з якімі асобныя ўдзельнікі групы ўсталявалі сувязь. Кіраўнік спецгрупы Крылатых знаходзіўся пры партызанскай брыгадзе Біруліна і іншых, кіраўніцтва ўдзельнікаў групы, якія знаходзіліся на нелегальным становішчы, ажыццяўляў праз сувязных [5, л. 1].

Ірына і Міра Чжан Ван-фу прынялі прапанову Крылатых і сталі працаваць разведчыцамі і сувязнымі армейскай групы. Праз іх армейская група ўстанавіла сувязь з групай Ліп-ці, паколькі Ірына, Міра добра ведалі ўсіх, якія працавалі ў пральні кітайцаў яшчэ да вайны [2, л. 4].

Перабраўшыся з пачаткам вайны ў Маркавічы, сям'я Чжан Ван-фу здала свой дом у Віцебску ў арэнду, захаваўшы за сабой пакой, што вельмі спатрэбілася Ірыне для сувязі з горадам. Дзяўчына назірала за перамяшчэннямі нямецкіх вайсковых частак і за тымі, «хто прыслужваў немцам», дастаўляла партызанам нямецкія газеты, а ад іх прыносіла лістоўкі, якія хавала ў тайніку ў сваім пакоі. Амаль заўсёды Ірына хадзіла на сувязь разам з сястрой Мірай, паколькі тая, як дзіця, вызывала менш падазрэнняў і магла прайсці там, дзе ход для старэйшай сястры быў зачынены [4, с. 73–74].

З сакавіка 1943 г. Міра Аляксандраўна Чжан Ван-фу сышла ў партызаны брыгады Біруліна. Са жніўня 1943 г. Зінаіда Аляксандраўна Шаракова стала партызанкай брыгады «Аляксея» (А. Ф. Данукалава), якая дзейнічала ў Віцебскім і іншых Віцебскай вобласці [2, л. 7].

Правал у пральні адбыўся ў верасні 1943 г. З успамінаў Сяргея Сюдаболя пра падпольную дзейнасць у горадзе Віцебску ў гады Вялікай Айчыннай вайны: «У верасні 1943 года нас хтосьці выдаў. Гэта здарылася пасля таго, калі мы адправілі партызанам адразу 17 каністраў бензіну, Андрэй Ліп-ці, Чу-Чалін і я былі арыштаваны. Ліп-ці, Чу-Чаліна расстралялі. Мяне накіравалі ў канцлагер, дзесьці пад Бабруйскам, адкуль я бег. Пасля вайны вярнуўся ў Віцебск на ранейшае месца працы, у партыі не аднаўляўся, улічваючы свой узрост і цяжкасці зносін з людзьмі з-за дрэннага ведання мовы» [2, л. 17].

Такім чынам, у гады Вялікай Айчыннай вайны ў пральні Віцебска, дзе кітайскія работнікі разам з мясцовымі актывістамі сфарміравалі надзейную сетку для перадачы разведвальнай інфармацыі і забеспячэння партызан у неабходным матэрыяле. Нягледзячы на рэпрэсіі і здрады, кітайцы працягвалі змагацца, ахвяруючы жыццём дзеля агульнай перамогі. Іх уклад у барацьбу супраць нацызму застаецца прыкладам інтэрнацыянальнай салідарнасці і мужнасці ў найцяжэйшых умовах акупацыі.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Подпольные партийно-комсомольские организации Витебской области в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. // Национальный архив Республики Беларусь. Ф. 1391. Оп. 1. Д. 9.

2. Документы о включении подпольной группы, действующей в прачечной г. Витебска, в состав Витебского партийно-комсомольского подполья (постановление, справки, заключения, воспоминания, личные листки) // Национальный архив Республики Беларусь. Ф. 1391. Оп. 1. Д. 12.

3. *Воронкова И. Ю.* Беларусь и Китай: общие страницы военной истории (1921–1960 гг.). Минск: Беларуская навука, 2022. 430 с.

4. *Воронкова И. Ю.* Уроженцы Китая в Витебском антифашистском подполье (1942–1943) // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: [зборнік навуковых артыкулаў] / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Мінск. 2021. Вып. 19. С. 69–75.

5. Справки УКГБ по Витебской обл. и воспоминания участников о деятельности подпольной группы П. А. Крылатых в г. Витебске // Национальный архив Республики Беларусь. Ф. 1391. Оп. 1. Д. 15.